# Да духоўных каранёў

**Сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пачынаюцца VIII Беларускія Калядныя чытанні "Глабальныя выклікі сучаснасці і духоўны выбар чалавека".**



Мерапрыемства, якое стала ўжо традыцыйным, арганізавана Беларускай Праваслаўнай Царквой пры падтрымцы міністэрстваў адукацыі, культуры, аховы здароўя, інфармацыі, працы і сацыяльнай абароны, Нацыянальнай акадэміі навук. У форуме прымаюць удзел прадстаўнікі царквы, заканадаўчых і выканаўчых органаў улады, сферы адукацыі, культуры, вучоныя, кіраўнікі і педагогі ўстаноў адукацыі, навучэнская моладзь, медыкі, работнікі сацыяльнай сферы.

***Пад эгідай VIII Беларускіх Калядных чытанняў у Выдавецкім доме "Педагагічная прэса" адбудзецца пасяджэнне круглага стала "Духоўны выбар чалавека".***

Такая высокая прадстаўнічасць форуму пацвярджае яго значнасць для праваслаўя, нашай дзяржавы і грамадскасці, адзначыў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін:

— Калядныя сустрэчы ўмацоўваюць супрацоўніцтва царквы і нашай краіны, даюць магчымасць назапасіць і абагульніць існуючы вопыт, намеціць новыя сумесныя дзеянні, вызначыць прыярытэты і тэмы духоўнага ўзбагачэння кожнай асобы. Забяспечыць пераемнасць пакаленняў у духоўным станаўленні магчыма толькі тады, калі мы будзем засноўвацца на высокіх маральных устоях, хрысціянскіх традыцыях і будзем гатовы іх захоўваць і прымнажаць.

Па словах мітрапаліта, ідэя форуму — заклікаць сучаснага чалавека зрабіць выбар сваёй душы, які павінен засноўвацца на духоўных законах:

— Духоўнасць — гэта наша сапраўднае багацце. Яна фарміруе ўнутраны свет, дапамагае ў любых жыццёвых сітуацыях заставацца чалавекам, мець свой стрыжань, сваю грамадзянскую пазіцыю, яна выхоўвае і загартоўвае. Гэта было і ёсць вельмі актуальна, асабліва сёння, калі свет становіцца ўсё больш раз'яднаным. Мы павінны аб'яднацца і прайсці складаны, цярністы шлях захавання нашых традыцый, нашай гісторыі, культуры.

Як адзначыў старшыня Сінадальнага аддзела па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі Беларускай Праваслаўнай Царквы протаіерэй Фёдар Поўны, за гады правядзення Калядных чытанняў іх арганізатары ўпершыню адступілі ад традыцыі прысвячаць мерапрыемства юбілейным датам альбо гістарычным падзеям. Сёлетнія чытанні ў большай меры скіраваны на сучасныя глабальныя праблемы, якія хвалююць не толькі нас, але і ўвесь свет:

— У наш час мы жывём у самой гісторыі, калі кожны народ і нават кожны чалавек не толькі ў нашай краіне, не толькі вакол нас, а на ўсёй планеце Зямля стварае сваю будучыню.

Протаіерэй Фёдар Поўны паведаміў, што сёлетнія чытанні маюць новы фармат — гэта дазволіць прадставіць і абмеркаваць найбольшую колькасць разнастайных тэм і тым самым прыцягнуць больш слухачоў, у першую чаргу моладзь. Калядныя чытанні павінны стаць своеасаблівай пляцоўкай для шчырага дыялогу, для даверальнай сяброўскай гутаркі з маладымі людзьмі пра духоўныя каштоўнасці, пра сэнс жыцця, свой выбар. Вельмі важна прывіваць маладому пакаленню духоўныя традыцыі, вучыць іх сямейным каштоўнасцям, выхоўваць любоў да Радзімы, грамадзянскасць і патрыятызм. Для некаторых маладых людзей гэта будзе ўвядзеннем у праваслаўе, яго гісторыю, першае знаёмства з царкоўнымі канонамі, для іншых — асэнсаванне і ўмацаванне сваёй духоўнай пазіцыі.

— Толькі звярнуўшыся да духоўных каранёў, мы можам ісці наперад і ствараць нашу будучыню, — адзначыў Фёдар Поўны.

Сёння адбудуцца асноўныя падзеі форуму, у якім шырока прадстаўлена адукацыйная галіна. Яе работнікі выступаюць не толькі ў ролі слухачоў, але і актыўных удзельнікаў. На пленарным пасяджэнні выступіць рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар Д.У.Дук, які закране тэму "Асэнсаванне сучасных геапалітычных падзей у святле духоўных урокаў". Дырэктар Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа К.А.Пятруцкая, кандыдат педагагічных навук, раскажа аб кампліментарным падыходзе да духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання школьнікаў у пачатковых класах.

Семінары, канферэнцыі, круглыя сталы Калядных чытанняў — больш за 30 мерапрыемстваў — пройдуць у Мінскай духоўнай акадэміі, духоўна-асветніцкім цэнтры, на іншых пляцоўках.

Правядзенню Беларускіх Калядных чытанняў папярэднічалі сумесныя мерапрыемствы сістэмы адукацыі з рэгіянальнымі епархіямі. Так, у прыватнасці, у Гомельскай епархіі адукацыйныя чытанні прайшлі пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама. У Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Моладзь. Духоўнасць. Айчына: гісторыя і выклікі сучаснасці". У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы адбылася дыялогавая пляцоўка студэнцкага актыву з прадстаўнікамі Гродзенскай епархіі "Сямейныя каштоўнасці ў беларускім грамадстве".

Па сутнасці, уся наша краіна далучана да Калядных чытанняў, якія не толькі нясуць духоўны пасыл нашаму грамадству, але і з'яўляюцца прадвеснікам калядных свят, а значыць, новых надзей, спадзяванняў, здзяйснення светлых мар.

**Ала КЛЮЙКО.**